| Цытата | Мова |
|---|---|
| 1. Месяц чырвоны над нізкім туманам,<br>Нізкі туман карагодзіць над лугам,<br>Там, дзе чароты зялёным паўкругам<br>Глухнуць у крэхаце жаб несціханым<br>(“Шарая гадзіна”, пераклад Максіма Багдановіча). | |
| 2. Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое:<br>Не цэнім маючы, а страцім, залатое, –<br>Шкада, як і красы твае, мой родны краю.<br>Тугою па табе тут вобраз твой ствараю<br>(пераклад Язэпа Семяжона). | |
| 3. Поодаль в лесу было мрачновато от темной мешанины елей, подлеска, каких-то неясных теней, беспорядочного сплетения стылых ветвей; вблизи же, на чистой белизне снега, дорога просматривалась без труда. То, что она пролегала здесь по нетронутой целине, хотя и затрудняло ходьбу, зато страховало от неожиданностей … Впрочем, случайная стычка в лесу или в поле не очень страшила Рыбака: у них было оружие<br>(пераклад Васіля Быкава). | |
| 4. Ці не добра было бы нам, брацці,<br>Старадаўнымі словы пачаці<br>Сказ аб Ігара трудным паходзе,<br>Святаславіча-князя прыгодзе?<br>А пачацца сягачасным ладам<br>Песні той, – не Баянавым складам!<br>(пераклад Янкі Купалы) | |

**Заданне 9.** Запоўніце вольныя ячэйкі ў табліцы. Вызначце жанр працытаваных твораў.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Аўтар | Назва твора | Цытата | Жанр |
|---|---|---|---|
| Кандрат Крапіва | | – Дзядзечка, твой лыч у брудзе!<br>Нязграбна гэта й між свіней,<br>А што ж, калі заўважаць людзі? | . . . . а |

| | |
|---|---|
| 'вокліч абурэння, асуджэння таго, хто сказаў што-небудзь непрымальнае' | |
| 'нічога не гаварыць лішняга, быць асцярожным у выказваннях; маўчаць, калі трэба' | |
| 'хто-небудзь бясследна знік, перастаў існаваць ці што-небудзь раптоўна знікла' | |
| 'дазваляць сабе гаварыць лішняе; лаяцца' | |
| 'хто-небудзь вельмі балбатлівы, гаворыць лішняе' | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Поближе к зоопарку, в доме у детской площадки, обезьянки увидели в окошке старушку с зонтиком под мышкой. Старушка стирала в маленьком тазике свои наволочки и тоже справлялась сама. Совсем рядом с детской площадкой две толпы, школьников и дошкольников, о чём-то спорили, и обезьянки уже размечтались, что сейчас потребуется их помощь: мирить школьников с дошкольниками. Но те вдруг перестали спорить, начали все вместе поливать какое-то растение, торчащее возле качелей *(По Г. Б. Остеру)*.

вада, і – дзякуй богу. Ідзі, хлюпай пасталамі, вядзі касой мерна, роўна, справа – налева, справа – налева. Праўда, трохі цяжэй стала ісці – касу трэба амаль увесь час трымаць навісу, многа вады. Касіць тут не тое, што на сухім месцы. Запытай любога ..., і ён табе скажа, што Мокуць – чортава месца, гіблае для касца. (________________________________________)

2. Яна была больш чым проста жонкай, яна была другам да смерці. Мы жылі доўга і шчасліва, як у песні: Пакуль сонца зззяла над грэшнай зямлёю... Але яшчэ і зараз я часам бачу ў сне сівыя верасовыя пусткі, чэзлую траву на паверхні прорваў і ***, якое скача па дрыгве. Не бразгаюць цуглі, моўчкі сядзяць у сёдлах прамыя постаці коннікаў. Вецер развейвае іх валасы, плашчы, грывы коней, і самотная гострая зорка гарыць над іхнімі галовамі. ... Я прачынаюся і думаю, што не прайшоў ягоны час, пакуль ёсць цемра, голад, нераўнапраўе і цёмны жах на зямлі. Яно – сімвал усяго гэтага. Хаваючыся напалову ў тумане, імчыць над змрочнай зямлёй ***. (________________________________________)

3. Наўздагон за зніклай чарадой, з апошніх сіл перабіраючы крыллямі, не дужа высока ляцеў, быццам шкандыбаў у паветраным абшары, адсталы падбіты журавок. Ад яго амаль чалавечай роспачы аж здрыгануўся здзіўлены ***, нешта суладнае сваім затоеным пакутам пачуў ён у тым жалобным голасе, і грымаса болю і жалю скрывіла яго круглявы хлапечы твар. А жураўель крычаў, кідаў у ветраны прастор дарэмныя гукі трывогі, махаў і махаў аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог. Баец аберуч ухапіўся за галаву, заціяў вушы, напяўся, з усяе сілы сціснуўся, каб толькі стрываць. (________________________________________)

4. Увосень у Бярэзаўцы рака мялела і рана жаўцелі бярозы, – раслі на балоце. Жаўцелі заўсёды знізу, паволі, не так, як вольхі, якія чакаюць першых маразоў, тады чарнеюць і асыпаюцца за адну ноч. Цішыня стаяла ўсюды: і ля хаты, і на пасецы, і на балоце – з вёскі сюды не далятае ніводнага гуку. Затое тут жыло сваё рэха – дзень і ноч, зіму і лета, асабліва ўвосень.

(________________________________________)

5. І Серж пабег, азіраючыся, а стары чалавек доўга стаяў і ківаў галавой. Пасля ён паволі пайшоў тратуарам, звыкла сабе пакульгваючы на левую нагу і пастукваючы палкай па мокрых асфальтавых плітах. Ён дайшоў да чыгуначнага пераезда. Шлагбаум быў спушчан. Стары чалавек астаўся чакаць, пакуль пройдзе поезд. Бадай што ўжо зусім змеркла. ... Поезд прайшоў, шлагбаум падняўся, стары чалавек перайшоў праз рэйкі і ўвайшоў у глухі завулак. ... У канцы завулка стаяў трохпавярховы вялікі стары дом. У ім было многа дзвярэй і вокан. Тынк на яго сценах даўно ўжо змылі дажджы, і дом пачарнеў. Цяпер у вокнах гэтага дома свяціліся агні і з сярэдзіны чулася музыка.

**Заданне 4.** *«Ах, Лявоніха, Лявоніха мая!»* – успамінае добрым словам жонку Лявона – весялуху і працаўніцу – М. Багдановіч. А як называюць жонку *салдата, барона, дзядзькі, брата, грабара*? Запоўніце табліцу па ўзоры.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала за кожнае правільна падабранае, 0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і кожны правільна вызначаны сродак словаўтварэння)*

| Значэнне слова | Слова | Утваральная аснова і сродак словаўтварэння |
|---|---|---|
| **Узор: *'жонка Лявона'*** | *Лявоніха* | Лявон (□) + іх(а) |
| 'жонка салдата' | | |
| 'жонка барона' | | |
| 'жонка дзядзькі' | | |
| 'жонка брата' | | |
| 'жонка грабара' | | |

**Заданне 5**. Дапішыце ў табліцу, дзе трэба, назоўнікі ў форме адзіночнага ці множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал за кожнае правільна запісанае слова)*

| Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|
| | поцемкі |
| кляймо | |
| | двайняты |
| бутля | |
| | дзяўчаты |

**Заданне 6**. Падбярыце беларускія адпаведнікі да прапанаваных словазлучэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| |
|---|
| 1. ожидаемый результат – |
| 2. обслуживающий персонал – |
| 3. определяющая роль – |
| 4. разлезшиеся ботинки – |
| 5. странствующий театр – |

3. Эх, **што за** хваля і як дужа, разгонна, смела і агромна плыве па струнах т
з-пад Нёмна! (Я. Колас)

________________________

4. **Што** ты спіш, што ты спіш, беларускі мужык? (Я. Купала

________________________

5. Зямля! **Што** зрабілі з табою, з тваёю крынічнай душою? (М. Башлакоў).

________________________

**Заданне 7.** Адрэдагуйце выказванні, запішыце іх правільныя формы.

*Максімальная колькасць балаў –*

1. Палуднуючы, я ішоў на тыя грудкі памагаць маме падносіць кошыкі бульбай і ссыпаць.

2. Не спытаю, чаму і завошта адрываюць ад бацькаўскіх ніў – я юнацтва радасцяў коштам за каханне сваё аплаціў.

3. На двары было пуста, дзвер у хату і ў хлеў былі пазачыняны.

4. Я гартаў падшыўку «Футбола» і даведваўся пра дзівоснага варатара Барыс Разінскага, які выдатна бараніў не толькі вароты, але і забіваў галоў, з пенальц больш за многіх нападаючых.

5. Ёй, бачыце, падавай купленую фанерную шафу на двое створак, дзе ёсць палічкі, і вешакі для дзявочых убораў.

**Заданне 8.** Вызначце, на якой мове першапачаткова былі напісаны творы, урыўкі якіх прыведзены ў табліцы.

*Максімальная колькасць балаў –*

**Заўвага**: у адным і тым жа фразеалагізме кампанент ***камень*** можа быць ужыты больш чым адзін раз.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| 'хто-небудзь адчувае душэўны цяжар' | |
| 'рабіць неадабральны намёк у чый-небудзь адрас' | |
| 'сутыкнуліся розныя непрымірымыя погляды, інтарэсы, характары і інш.' | |
| 'знішчыць ушчэнт, разбурыць да канца' | |
| 'хто-небудзь адчуў палёгку, пазбавіўся ад якіх-небудзь клопатаў, перажыванняў' | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Эта огромная мрачная зала, в которую я так боялась входить, сверкала теперь тысячью огней. Как будто море света хлынуло на меня, и глаза мои, привыкшие к темноте, были в первое мгновение ослеплены до боли. Ароматический воздух, как горячий ветер, пахнул мне в лицо. Бездна людей ходили взад и вперед; казалось, все с радостными, веселыми лицами. Женщины были в таких богатых, в таких светлых платьях; всюду я встречала сверкающий от удовольствия взгляд *(По Ф. М. Достоевскому)*.

№___

Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава весела знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя. Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр – грубку з белай кафлі.

№___

Ж ы г і м о н т. Барба-а-а...
Ч о р н а я П а н н а. Абліты цьмяным срэбрам лес і дол.
Ж ы г і м о н т. Любая...
Ч о р н а я П а н н а. І болей не чутно птушыных песень.
Ж ы г і м о н т. Родная...
Ч о р н а я П а н н а. Усімі зоркамі мяне цалуе ноч.

№___

Ажно пакуль камароўскі не крыкнуў ім:
– Гэта ж Ляновічыха!

Імя гэтае як бы ўсё ім растлумачыла, і яе не толькі тут жа прынялі ў шайку, але, бадай, ужо лічылі завадатаркай; каб іх арыштавала ў той час міліцыя, то, безумоўна, усе тыя смельчакі паказалі б на яе: гэта яна першая!

**Заданне 9.** Закрэсліце факты, якія вы лічыце недакладнымі.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1.** Падчас знаходжання ў Францыі Адам Міцкевіч чытаў лекцыі ў Парыжскім універсітэце.

**2.** У арганізацыю БелАПП уваходзілі выдатныя майстры слова Казімір Сваяк, Гальяш Леўчык, Антон Навіна, Ядвігін Ш., М. Гарэцкі.

**3.** Першы купалаўскі зборнік “Жалейка” мог і не выйсці. Фундатар Аляксандр Ярэміч доўгі час думаў, якому творцу аддаць грошы. Паміж Сяргеем Ясеніным і Янкам Купалам выбраў Купалу.

**4.** Самуіла Плаўніка выключылі з ешыбота[1] праз вершы, прысвечаныя ўяўнай дзяўчыне Мірыям. Ягоную кніжку спалілі на падлозе сінагогі, а сябры адракліся ад паэта.

**5.** Радкі У. Дубоўкі *«У ветры дзікім не загінеш, // чарнобылем не зарасцеш...»* прысвечаны памяці пра Чарнобыльскую трагедыю.

**Заданне 10**. Вызначце паводле стылю аўтара і назву мастацкага тэксту.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**1**. Нагам стала мокра. Спачатку вада толькі чулася, дзе пасталы ўціскалі пакошу, потым стала хлюпаць між куп'я. Неўзабаве *** ужо ўвайшоў у ваду, якая абступіла, нібы нанова абгарнула ногі. Анучы ўраз прамоклі, калошыны знізу таксама сталі мокрыя, і ногі зрабіліся важчэйшыя, быццам самі набраклі вадою. ... Цёплая

[1] ***Ешыбот*** – вышэйшая школа па падрыхтоўцы рабінаў – служыцеляў культу ў іўдаізме, суддзя па пытаннях рэлігійнага і сямейнага жыцця ў яўрэйскай абшчыне.

Запішыце іх імёны і прозвішчы на сучасную карту Беларусі ў адпаведнасці з месц нараджэння.

*Максімальная колькасць балаў -*



**4.** Доўга я гадаў і думаў, як сябе зваць, ці то палякам, ці то літоўцам, бо слова "тутэйшы" мне нексць не смакавала. І так колькі гадоў я хістаўся то на ту, то на другую сторану, аж покі не папала ў мае рукі «Дудка» Мацея Бурачка: яна-то мне сказала, што хто гаворыць па-тутэйшаму, па-мужыцку, значыцца, ён гаворыць па-беларуску, а хто гаворыць па-беларуску, той беларус. Прачытаўшы тую "Дудку", я сказаў: "Дзякуй табе, Мацей Бурачок! Чэсць і слава тваему слову! А ты, "Дудка", грай і мне голас дай". З таго дня пачаў і я майстраваць інструмант. Выйшла з-пад рук "Скрыпка". (______________________________)

**5.** Потым яшчэ цяжэйшыя выпрабаванні для тых, хто ахрысціцца хацеў, прыйшлі. Знаходзім бо ў пасланнях настаўнікаў і ў некаторых правілах: тыя, што хрысціцца хацелі, перш немалы час павінны былі асобна ад іншых у царкве стаяць; на калені прыпадаць, чытанне Евангелля пачуўшы; а больш таго, калі пачыналася вячэра Госпадава, вон з царквы выходзілі; таксама вызначаны час пасцілі і кожны тыдзень у чацвер "Веру…" перад епіскапам ці прасвітарам вызнавалі. А пакуль гэта ўсё хто не выканае, ахрышчаным быць не мог, але звалі яго "абвешчаным", а па-грэцку – "катэкуменос". Навуку ж іхнюю такую называлі Абвяшчэннем, па-грэцку – Катэхізіс. (______________________________)

**Заданне 9.** Прачытайце цытаты. Адкажыце на пытанні, размешчаныя ў першай калонцы табліцы. Адказы запішыце ў трэцяй калонцы насупраць адпаведных цытат. Унізе, у апошнім радку табліцы, прывядзіце аўтарскае (альбо ўласнага сачынення) чатырохрадкоўе з парнай рыфмай, напісанае чатырохстопным ямбам.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Як бы вы вызначылі вершаваны памер наступных радкоў? | Заспявай жа ты песню такую,<br>Каб маланкай жахала яна<br>І паліла нядолю людскую,<br>Каб грымела, як гнеў перуна.<br>(Якуб Колас. «Песняру») | |
| **2.** | Якія тропы выдзелены курсівам? | …Што меж майму цярпенню не знайсці,<br>Што так вяліка мне яно ў жыцці,<br>*Як мільёнаў разам усіх цярпенне.*<br>(Янка Купала. «Маё цярпенне») | |
| **3.** | Які сродак сінтаксічнай выразнасці ўжыты ў выдзеленых фрагментах тэксту? | Усё праходзіць, быццам дождж няроўны,<br>–<br>*І* боль, *і* злосць, *і* дробная брыда,<br>А застаецца важны і галоўны<br>*І* самы светлы талент – дабрата.<br>(Сяргей Грахоўскі. «Дабрата») | |

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі
_________________ Р.С. Сідарэнка

«11» _____________ 2017 года

ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

### Варыянт I

**Заданне 1.** Вызначце, на які склад прыпадае націск у формах назоўнага склону прыведзеных у табліцы слоў, калі яны ўжываюцца ў множным ліку і ў спалучэнні з лічэбнікамі *два (дзве)*, *тры*, *чатыры*. Парадкавы нумар націскнога склада ў словаформе і літару, што абазначае націскны гук, запішыце ў адпаведным слупку паводле ўзору, паказанага для слова *качарга*.

*Максімальная колькасць балаў* – ***4*** (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| **Адзіночны лік** | **Множны лік** | **З лічэбнікамі *2, 3, 4*** |
|---|---|---|
| **Узор:** ***качарга*** | **2, э** | **3, і** |
| *поплаў* | | |
| *верацяно* | | |
| *ліфт* | | |
| *пяро* | | |

**Заданне 2**. З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***кот*** (таксама ў патрэбнай граматычнай форме), запісаўшы іх у правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *гуляць, і, мышка, мяшок, па, прабегчы, пята, у, у, ў, укінуць, хата, чорны*.

*Максімальная колькасць балаў* – ***5***.

| Сінтаксічная роля | Сказ |
|---|---|
| 1. дзейнік | |
| 2. дапаўненне | |
| 3. азначэнне | |
| 4. акалічнасць | |

**Заданне 7.** Без сумнення, кожны з вас карыстаўся жартаўлівымі фразамі, пабудаванымі на спалучэнні гукаў, якія робяць цяжкім яе (фразы) вымаўленне. Іх называюць… Запішыце, як іх называюць, які моўны прыём выкарыстоўваецца пры іх стварэнні, як гэты прыём дзейнічае. Прывядзіце ўласны прыклад такой фразы.

*Максімальная колькасць балаў* – *5* (**0,5** бала – за назву фразы, **0,5** бала – за моўны прыём, **2** балы – за апісанне механізму дзеяння гэтага прыёму, 1 бал – за ўласны прыклад).

______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________
______________________________________________

**Заданне 8.** Пранумаруйце ўрыўкі з мастацкіх твораў так, каб яны размясціліся ў храналагічным парадку паводле часу напісання.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**№___**

Слухаў хлопчык тое гранне,
Пад сабой не чуў зямлі,
Бо ў тых зыках чараванне
Спевы ўласныя плылі,
Струны сэрца ў ім дрыжалі,
Як дрыжыць бліскание зор
У надземнай цёмнай далі,
І музыкам падпявалі
І ляцелі на прастор.

**№___**

…На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазьні блізка жыў.
Што ж, чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губы ён ня браў,
Затое ў ласцы быў у пана –
Яго пан дужа шанаваў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| | «Я хацеў бы спаткацца з вамі на вуліцы…» | Хто мы такія?<br>Толькі падарожныя, –<br>папутнікі сярод нябёс. | . . . . . . р |
| Максім Багдановіч | | Яго звычаі – арліныя,<br>Яго ўцехі – сакаліныя;<br>Пер'і-пер'ечкі бялеюцца<br>Ды на золку агнявеюцца.<br>У яго ў крыле – трыста тры пяра:<br>Узмахне крылом – быццам бор шуміць,<br>Узмахне другім – што мяцель гудзіць. | . . . а . . |
| | Беларуска-літоўскі летапіс 1430–1446 гадоў | Як не дзівіцца славе вялікага гаспадара. Няма земляў ні на ўсходзе, ні на захадзе, адкуль не прыходзілі б пакланіцца гэтаму слаўнаму гаспадару. Калі нават ёсць цар над усёю зямлёю, і той, прыйшоўшы, кланяўся слаўнаму гаспадару, вялікаму князю Аляксандру, яшчэ званаму Вітаўтам. | . . х . . . . |
| Уладзімір Караткевіч | | Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць буслы. Іх многія і многія тысячы – хто лічыў? На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. ... І таму мне здаецца, што ў гэтыя – і не толькі ў гэтыя – дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць "зямлёю пад белымі крыламі". | . . . ы . |

**Заданне 10.** Вызначце аўтараў паводле назваў іх твораў: **1)** «Плачка», «Сын Буры» «Вужыная карона», **2)** «Мая дудка», «Кепска будзе!», «Хмаркі», **3)** «Ідылія», «Гапон» «Пінская шляхта», **4)** «Бывай», «Мая Бесядзь», «Над брацкай магілай», **5)** «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся», «Што думае Янка, везучы дровы ў горад».

| | | | |
|---|---|---|---|
| **4.** | Як называюцца выдзеленыя словы, ужытыя ў мастацкім тэксце? | – Ну, куды? – Яўхім павёў плячамі. – Ну, пайду, пашукаю весялейшай *кумпаніі*!..<br>– Глядзі, *недалёко. Штоб* на бандзітаў не нарвацца! Чуў я, у Мокуці ўчора *булі*...<br>(Іван Мележ. «Людзі на балоце») | |
| **5.** | | | |

**Заданне 10.** Вызначце аўтараў паводле назваў іх твораў: 1) Прадмова да кніг «Юдзіф», «Псалтыр», 2) «Чортаў скарб», «Балада пра Вячку, князя людзей простых», 3) «Магіла льва», «Мая малітва», 4) «Ты, мой брат, каго зваць Беларусам... », «Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць», 5) «Гражына», «Пан Тадэвуш».

Запішыце іх імёны і прозвішчы на сучасную карту Беларусі ў адпаведнасці з месцам нараджэння.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



**Заданне 7.** Як кажуць, розум не купіш – у галаву не улієш. Але ў кожнага свая галава на плячах, як *у рыбы – рыбіна, у рысі – рысіная.* **А чыя галава ў *сарокі, тхара, авечкі, вярблюда, аленя*?** Вызначце і запішыце, выкарыстоўваючы адпаведныя прыметнікі.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

у сарокі – ______________
у тхара – ______________
у авечкі – ______________
у вярблюда – ______________
у аленя – ______________

**Заданне 8.** Прачытайце ўрыўкі з вядомых прадмоў. Вызначце, хто іх аўтар і да якога тэксту (кнігі) яны напісаны.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1. Але даў бы тое Госпад, каб вы, кожны сам па сабе, о шляхетныя панове, якія засталіся нібы бацькамі гэтай мовы пасля гэткіх слаўных продкаў сваіх і месцы іхнія занялі, паколькі ў гэтай (справе) ніякае дапамогі ад людзей з-за граху няма, то толькі вы самі гэтаму з любові да Айчыны маглі б дапамагчы… У гэтай патрэбе Айчыны вашай, у звычайным клопаце аб недастатковасці навукі братам вашым (будзьце) прыкладам міласэрным… – каб гэтаму вашаму народу, невуцтвам сапсаванаму і засмучанаму, дапамагчы... Вось бы для навукі, але не такой, як цяпер на адвечны свой сорам толькі ледзь-ледзь прачытаць на сваёй мове збольшага вучацца, – каб заснаваці школы і навуку Божага слова, на працягу гэтулькіх год занядбалую, узняць захацел брацii вашай (дапамагчы) і змаглі. (______________)

2. ДА НАЙЯСНЕЙШАЙ УЛАДАРКІ І ПАНІ БОНЫ З ЛАСКІ БОЖАЙ КАРАЛЕВЫ ПОЛЬШЧЫ, ВЯЛІКАЙ КНЯГІНІ ЛІТВЫ, РУСІ, ПРУСІІ І ІНШ. ПАНІ Калі ж ты праявіш сябе добразычлівай, схільнай да апякунства навукі і мастацтва тады ад іх будзе і дзяржаве вялікая карысць, а высокая слава імя твайго распаўсюдзіцца такім чынам яшчэ вышэй з ухвалай тваіх (выхаванцаў). Бо што можа быць больш цудоўным і вартым тваіх продкаў і тваёй найслаўуцейшай з арагонскага дома сям'і, больш дасканалым з усіх форм дабрачыннасці, калі на іх грунтоўна глядзець і ў мірны час, і ў вайну, і ў справе рэлігii? (______________

3. Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленька Булгарыя – са жменя таго народу, – якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другі пабратымцы нашыя … маюць па-свайму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газэты, набожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баячкі; і дзеткі іх чытаюць так, як гаворацць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што "піша па-мужыцку", і як дурня абсмяялі б А можа, і праўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць н можна? Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другі добрым людцам… (______________)

| | |
|---|---|
| 'вельмі малы, невысокі, нізкарослы' | |
| 'той ці тое, пра вартасці якога загадзя не ведаеш; невядомае, няпэўнае' | |
| 'сапсаваліся адносіны паміж кім-небудзь; хто-небудзь пасварыўся з кім-небудзь' | |
| 'выклікаць сварку, пасварыць каго-небудзь (часцей мужа з жонкай)' | |
| 'хітраваць, стараючыся падмануць каго-небудзь' | |

**Заданне** 3. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

У самой головы оврага, в нескольких шагах от той точки, где он начинается узкой трещиной, стоит небольшая четвероугольная избушка, стоит одна, отдельно от других. Она крыта соломой, с трубой; одно окно, словно зоркий глаз, обращено к оврагу и в зимние вечера, освещенное изнутри, далеко виднеется в тусклом тумане мороза и не одному проезжему мужичку мерцает путеводной звездою *(По И. С. Тургеневу)*.

**Заданне 4.** Пазнайце назвы асоб мужчынскага полу па іх значэннях. Вызначце, як ўтварыліся словы.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6*** (0,5 бала за кожнае правільна запісанае слова, 0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0,5 бала за кожны правільна вызначаны сродак словаўтварэння).

| Значэнне слова | Слова | Утваральная аснова | Сродак словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| **Узор: '*той, які танцуе*'** | *танцорка* | *танцор* (□) | *-к-* |
| *'той, хто заступаецца за каго-небудзь, абаронца'* | | | |
| *'смелы чалавек'* | | | |
| *'акцёр, які іграе камічныя ролі'* | | | |
| *'той, хто рэгулюе рух на дарогах'* | | | |

**Заданне 5**. Дапішыце ў табліцу, дзе трэба, назоўнікі ў форме адзіночнага ці множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў* – ***5*** (1 бал за кожнае правільна запісанае слова).

| Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|
| | карункі |
| | блізняты |
| прасціна | |
| | даспехі |
| дно | |

**Заданне 6**. У крылатым выслоўі А. Вярцінскага *«Жыццё даецца, каб жыццё тварыць»* інфінітыў ***тварыць*** з'яўляецца выказнікам. Складзіце і запішыце сказы, у якіх інфінітыў выступае ў ролі названых членаў сказа.

*Максімальная колькасць балаў* – ***4*** (*1 бал за правільна складзены сказ*).

**Заданне 4.** Пазнайце назвы асоб жаночага полу па іх значэннях. Вызначце, я ўтварыліся словы.

*Максімальная колькасць балаў – 6* (0,5 бала за кожнае правільна запісана слова, 0,5 бала за кожную правільна вызначаную ўтваральную аснову і 0, бала за кожны правільна вызначаны сродак словаўтварэння)

| Значэнне слова | Слова | Утваральная аснова | Сродак словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| Узор: *'жанчына, якая танцуе'* | *танцорка* | *танцор* (□) | -к- |
| *'смуглая жанчына, дзяўчына'* | | | |
| *'дачка лесніка'* | | | |
| *'тая, хто займаецца прадзеннем'* | | | |
| *'спецыяліст па шліфаванні'* | | | |

**Заданне 5**. Дапішыце ў табліцу, дзе трэба, назоўнікі ў форме адзіночнага ці множнага ліку.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (1 бал за кожнае правільна запісанае слова)

| Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|
| | бровы |
| дзяўчо | |
| | павекі |
| кашэль | |
| | шкарпэткі |

**Заданне 6.** Вызначце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляецца слова ***што*** ў сказах.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (0,5 бала за кожны правільны адказ

1. Я імя тваё звонам падкоў высякаю, **што** іскры, Рагнеда (У. Мазго).

________________________

2. І ва ўсіх нас ёсць Радзіма, **што** імёны нашы помніць (М. Танк).

________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

_____________ Р.С. Сідарэнка

«11» _____студзеня_____ 2017 года

ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Вызначце, на які склад падае націск у формах назоўнага склону прыведзеных у табліцы слоў, калі яны ўжываюцца ў множным ліку і ў спалучэнні з лічэбнікамі *два (дзве)*, *тры*, *чатыры*. Парадкавы нумар націскнога склада ў словаформе і літару, што абазначае націскны гук, запішыце ў адпаведным слупку паводле ўзору, паказанага для слова *качарга*.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ)

| **Адзіночны лік** | **Множны лік** | **З лічэбнікамі *2, 3, 4*** |
|---|---|---|
| **Узор:** *качарга* | **2, э** | **3, і** |
| *конь* | | |
| *год* | | |
| *галава* | | |
| *вясло* | | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***язык*** (таксама ў патрэбнай граматычнай форме), запісаўшы іх у правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *адсохнуць, без, воля, даваць, за, злізаць, зуб, каб, карова, косць, трымаць, як.*

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
_____________ Р.С. Сідарэнка

«11» снежня 2017 года

# ТРЭЦІ ЭТАП XXXIV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт І**

**Заданне 1.** Вызначце, на які склад прыпадае націск у формах назоўнага склону прыведзеных у табліцы слоў, калі яны ўжываюцца ў множным ліку і ў спалучэнні з лічэбнікамі *два (дзве)*, *тры*, *чатыры*. Парадкавы нумар націскнога склада ў словаформе і літару, што абазначае націскны гук, запішыце ў адпаведным слупку паводле ўзору, паказанага для слова *качарга*.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| **Адзіночны лік** | **Множны лік** | **З лічэбнікамі *2, 3, 4*** |
|---|---|---|
| **Узор:** ***качарга*** | **2, э** | **3, і** |
| *бервяно* | | |
| *зуб* (у роце) | | |
| *возера* | | |
| *сяло* | | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам ***камень*** (таксама ў патрэбнай граматычнай форме), запісаўшы іх у правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *агарод, з, зваліцца, каса, кідаць, на, на, на, найсці, не, пакінуць, сэрца, сэрца, у, як (нібы, быццам).*